Пятніца, 19 Люты 2021

37 сутак і 140 базавых. Полацкі суд пакараў удзельнікаў шпацыру арыштамі і штрафамі

Друкаваць (/news/sud/item/3905-37-sutak-i-140-bazavykh?tmpl=component&print=1) | Эл. пошта (/component/mailto/?tmpl=component&template=lt_news&link=073d5bdf5c05b6d959229ab3bcabeed352aeb97e)

Ацаніць гэты матэрыял (5 галасоў)



(/media/k2/items/cache/34c96fc26927fda6b9e4654ad88c4272_XL.jpg)

Полацкі суд 18 і 19 лютага «суткамі» і штрафамі пакараў семярых жыхароў гораду за тое, што яны нібыта фатаграфаваліся на фоне бел-чырвона-белага сцяга. Чацвёра палачан атрымалі вялікія штрафы, трое прысуджаныя да арыштаў.

Увечары 16 лютага ў раёне «Аэрадрому» ў Полацку затрымалі сем чалавек – пяць жанчын і дваіх мужчын. Усіх абвінавацілі ў арганізацыі незаконнага масавага мерапрыемства: фатаграфаваліся на фоне сцяга і выкладалі фота ў тэлеграм-каналах. Затрыманыя сваёй віны не прызналі.

На судзе міліцыянты не падалі ніякіх доказаў вінаватасці затрыманых – не было ні фотаздымкаў, ні фактаў іх публікацыі ў інтэрнэце. Затое былі сведчанні палачанкі Тамашэвіч, якая нібыта бачыла, як грамадзяне фатаграфаваліся са сцягам. Пазней аказалася, што гэта менавіта яна тэлефанавала ў міліцыю. Высветлілася таксама, што **Алена Тамашэвіч** – супрацоўніца СК. Затрыманнем жа мірных грамадзян 16 лютага кіраваў капітан міліцыі **Сяргей Лемеш**.

Судовыя паседжанні праходзілі па скайпе, калі затрыманыя знаходзіліся ў РАУС. **Дзяніс Кухто** асуджаны на 15 сутак арышту (суддзя Уладзімір Бясецкі), **Павел Хошчанка** – на 15 сутак (суддзя Людміла Блізнёва), **Валянціна Сергіенка** – на 7 сутак (суддзя Раіса Штуро), **Вольга Папкова** і **Марына Белавус** аштрафаваныя на 30 базавых велічынь (суддзя Віктар Баліка), **Ірына Рабіза** пакараная штрафам на 50 базавых велічынь (суддзя Дзергачоў), **Алена Барздукова** – на 30 базавых (Блізнёва).

У некаторых з затрыманых прайшлі пратрусы.

Аляксандр Марозаў

Апублікавана ў Суд (/news/sud)

Тэгі: Полацак (/itemlist/tag/Полацак) артыкул 23 34 КаАП (/itemlist/tag/артыкул%2023%2034%20КаАП) бел–чырвона–белы сьцяг (/itemlist/tag/бел–чырвона–белы%20сьцяг)

Яшчэ ў гэтым разьдзеле: « Віцебскі бізнесовец быў асуджаны на 7 сутак арышту за «чырвоную хвалю» на балконе (/news/sud/item/3902-na-7-sutak-aryshtu) Пракурор папрасіў для Юліі Кашаверавай 6 гадоў пазбаўлення волі » (/news/sud/item/3906-pazbaulennya-voli)

Вярнуцца ў пачатак (/news/sud/item/3905-37-sutak-i-140-bazavykh#startOfPageId3905)

© 2011 - 2023 Віцебская вясна (/). Пры выкарыстаньні матэрыялаў абавязковая гіпэрспасылка. Email: vitebskspring@proton.me (mailto:vitebskspring@proton.me)

(Https(/